…летары ўсіх краёў, злучайцеся!

…іцебскі …ралетары

…дзённая газэта гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

Кошт нум.— 5 кап.

№ 271 Пятніца 11 сьнежня 1931 г. Год выданьня XIV.

…най рэалізацыяй паказаньняў правадыра сустрэць апошні год пяцігодкі.

…гістарычнай прамове …гаспадарнікаў т. Ста… …анкрэтную праграму …еву, толькі карыстаю… …можна пасьпяхова …прамфінплян і фар… …лейшае сацыялістыч… …ніцтва.

…шні час умовы разь… …мысловасьці зьмянілі… …і, стварылася новая …а, якая патрабуе но… …аў кіраўніцтва». Гэ… …ньне правадыра пар… …да гэтага часу многі… …рнікамі і фабрычна… …арганізацыямі Віцеб… …раве не ператорана

…лы рабкораўскага рэй… …верцы рэалізацыі шась… …г. Сталіна на панчош… …ажным камбінаце імя …кія мы сёньня зьмя… …шай газэце, яскрава …ваюць тое, што пра… …рынцы яшчэ далёка …ана.

…шнай фабрыцы абязь… …квідавана ня толькі ў …нават яна існуе ва …эме гаспадарчага кі… …фабрыкі. Няма вы… …ў арганізацыі працы …ьмен і цэхаў. Ня ма… …іцтва нават такія пра… …водазабясьпячэньне …мясцовы транспарт. …ты, калі актывісты— …оты выступаюць су… …іквідацыі абязьлічкі. …ы Барэнбаум на ра… …ынгу, скліканым раб… …брыгадай, выступіў …абязьлічкі, гаворачы, …анікаў нельга пры… …да машын, бо нутра …аднолькавае». Па гэ… …рычыне нельга ўво… …го думцы, і прэмі… …рацы «бо ад… …боты, а …трэба …ваючайся …наце …па ста… …ае …рад гаспа… …нічных непаладак і …у выкананьні пляна… …ньняў.

…сноўныя пытаньні, як …ань набор рабочай сі… …льная яе расстаноўка, …скарыстаньне абсталя… …ногімі гаспадарчымі ар… …мі яшчэ не ажыцьцяў… …спадарчыя арганізацыі …юць належных мер да арганізацыі набору рабочай сілы шляхам дагавораў з калгасамі, спадзяваючыся на самацёк. Адсутнасьць цьвёрдага гаспадарчага кіраўніцтва і адказнасьці за работу асобных адзінак вытворчасьці прыводзяць да таго, што і пры наяўнасьці дастатковай колькасьці рабочых, абсталяваньне скарыстоўваецца нерацыянальна.

Маецца шэраг фактаў, якія паказваюць, што карэньні ўраўнілаўкі ў зарплаце яшчэ глыбока сядзяць на паасобных вучастках фабрык і заводаў і ствараюць стымул да цякучасьці рабочай сілы. Замест бальшавіцкага падыходу да ўстанаўленьня заробку па кваліфікацыі і ў адпаведнасьці з выконваемымі абавязкамі на панчошнай фабрыцы маюцца выпадкі вызначэньня пэнсіі «на вока». Асабліва брыдкія адносіны наглядаюцца да тэхнічных работнікаў. Памочнік тэхнарука фабрыкі застаецца пры стаўцы, якую ён атрымліваў, калі быў тэхнікам, калі ён нёс значна меншую адказнасьць. Ён атрымлівае толькі на 10 руб. больш заробку работніка складу. Гэты падыход да аплаты працы работнікаў не зьяўляецца стымулам у зацікаўленасьці работнікаў да падвышэньня прадукцыйнасьці працы.

Ні партыйныя, ні прафсаюзныя арганізацыі на панчошнай фабрыцы не займаліся пытаньнем палепшаньня становішча і ўмоў работы тэхнічнага пэрсаналу. Пры наліччы 24-х інжынэрна-тэхнічных работнікаў за час трохмесячнага існаваньня ф-кі ня было створана ІТС. Тэхнічныя сілы не мабілізаваны на хутчэйшае выкананьне паказаньняў т. Сталіна аб аўладаньні тэхнікі масамі. Фабрычна-завадзкія партарганізацыі ў першую чаргу нясуць непасрэдную адказнасьць за дапушчаны прабел у гэтай важнейшай справе. Неабходна арганізаваць працу так, каб уноў уліваючыяся рабочыя атрымалі той мінімум тэхнічных ведаў, які даў-бы ім магчымасьць узьняць сваю кваліфікацыю.

Побач з гэтым паўстае і другая важнейшая задача—аб пралетарскім перавыхаваньні ўноў прышоўшых з вёскі кадраў рабочых. Масавая работа партыйных і прафсаюзных арганізацый на прадпрыемствах павінна быць пабудавана так, каб яна забясьпечвала палітычнае і тэхнічнае запатрабаваньні рабочых.

Недапушчальна марудна ідзе ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў цэхі і брыгады. На панчошнай фабрыцы статыстычныя зьвесткі і сапраўднае становішча з гаспадарчым разрахункам яўна разыходзяцца. Гаспадарнікі абмежаваліся тым, што далі цэхам рахункаводаў, якія ператварыліся выключна ў касіраў па выплаце зарплаты.

Большасьць партыйных і прафсаюзных арганізацый не змагаюцца як сьлед за масавае аўладаньне гэтай важнейшай формай сацыялістычнай арганізацыі працы. Многія брыгады гаспадарчага разрахунку ня толькі ня маюць дагавораў, але і ня ведаюць сваіх задач. Арганізаваныя 16-га лістапада гаспадарча-разрахунковыя брыгады на новай панчошнай фабрыцы да гэтага часу не атрымалі растлумачэньняў аб іх задачах, да іх нават не прымацавалі мэханіка і ня склалі ўмоў для працы.

Там, дзе трыкутнікі ўзяліся па-бальшавіцку за рэалізацыю паказаньняў правадыра, маюцца добрыя вынікі. Так, на фабрыцы „Прафінтэрн“ шляхам мабілізацыі мас на выкананьне асноўных задач, заданьне па выкананьню прамфінпляну перавыканана. Завод «Чырвоны мэталіст» мае добрыя вынікі ў галіне арганізацыі і работы гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Да пачатку чацьвёртага, заключнага году—першай бальшавіцкай пяцігодкі засталося менш двух дэкад.

Партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны сустрэць новы гаспадарчы год з рашаючымі перамогамі.

12-га сьнежня адбудзецца пленум гаркому КП(б)Б, на якім будуць падводзіцца вынікі выкананьня пляну трэцяга году пяцігодкі па гораду і абгаварэньне кантрольных лічбаў на чацьверты год.

Узброіўшыся рашэньнямі пленуму, гарадзкія партыйныя арганізацыі павінны мабілізаваць масы рабочых і ІТР на бальшавіцкую падрыхтоўку да выкананьня пляну 1932 году і поўную рэалізацыю шасьці ўмоў т. Сталіна, якія забясьпечаць далейшыя перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Учора адчыніўся 2-гі пашыраны кантрольны пленум гаркому КСМ.

ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАДВЫСІЦЬ УДЗЕЛ

У ГАСПАДАРЧЫМ І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, ДАБІЦЦА ПОЎНАГА АХОПУ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ КАМСАМОЛАМ— баявыя задачы 13-тысячнага атраду віцебскай камсамоліі.

Камсамолія Віцебшчыны да 2-га кантрольнага пленуму

Другі кантрольны пленум гаркому камсамолу, які сабраўся напярэдадні 4-га, апошняга году пяцігодкі, павінен будзе падвесьці вынікі ўдзелу камсамоліі Віцебшчыны ў барацьбе за выкананьне пляна ў 3-га рашаючага, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Значны рост прамысловасьці Віцебшчыны паставіў перад камсамолам рад важнейшых задач, галоўнай з якіх зьяўлялася і зьяўляецца актыўны ўдзел пад кіраўніцтвам партыі ў гаспадарчым будаўніцтве.

Гэту задачу камсамолія Віцебшчыны ўзялася па-баявому выконваць. Рад камсамольскіх камітэтаў, калектываў і ячэек паказалі і паказваюць узоры бальшавіцкай барацьбы за прамфінплян, за якасьць, за аўладаньне тэхнікай.

Арганізацыяй праведзена вялікая праца па рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна. У сувязі з падрыхтоўкай да кантрольнага пленуму гаркому арганізаваны рад новых маладзёжных гаспадарча разрахунковых брыгад і плянава-апэрацыйных груп на буйнейшых прадпрыемствах. Так, 8-я камсамольская істужка фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», якая перайшла на гаспадарчы разрахунак, паставіла ўсесаюзны рэкорд выпрацоўкі: замест 850 пар адзінак па пляну яна зараз дае 1003. Істужка змагаецца ня толькі за колькасныя паказальнікі; у сувязі з пераходам на гаспадарчы разрахунак, палепшылася якасьць прадукцыі, зусім ліквідавана абязьлічка, скарочаны апэрацыі 4-га разраду, што дало за кароткі час тысячу рублёў эканоміі.

Па 8-й маладзёжнай раўняюцца другія істужкі і вучасткі фабрыкі. 7-я істужка да арганізацыі там маладзёжнай гаспадарча-разрахунковай брыгады ня выконвала свайго заданьня. Зараз выконвае яго па ўсіх паказальніках. Зусім зьнішчаны прагулы, палепшылася якасьць прадукцыі. Не адстаюць ад гэтай істужкі: 5-я істужка брочнага цэху, маладзёжныя вучасткі пінжачнага і ўцюжнага цэхаў і шэраг іншых.

На фабрыцы імя Лекерта гаспадарча-разрахунковая камсамольская брыгада выконвае свой прамфінплян на 100 проц. Зьнізіла нізкасортнасьць з адной пары на 1000 да адной пары на 3000, дае эканомію ў скарыстаньні фанітуры.

На заводзе «Чырвоны мэталіст» працуе 6 камсамольскіх гаспадарча-разрахунковых брыгад. Усе гэтыя брыгады паказваюць узоры ўдарнай работы. Камсамольцы—электразваршчыкі выконваюць свой прамфінплян на 150 проц. 13 унесеных камсамольцамі рацыяналізатарскіх прапаноў далі 2700 рублёў эканоміі.

Гаспадарча-разрахунковая камсамольская брыгада на інструмэнтальна-мэблёвай фабрыцы выконвае прамфінплян на 125 проц. Камсамолец Фёдараў унёс рацыяналізатарскую прапанову па выпрацоўцы інструмэнтаў (рубанкаў), ажыцьцяўленьне якой значна ўзьняла прадукцыйнасьць працы. Раней кожны рабочы выпрацоўваў 1700 рубанкаў у дзень, а зараз—і 2300. Ён-жа ўнёс прапанову, якая дае эканомію 10 тысяч рублёў у год.

Камсамольскія паравозныя ўдарныя брыгады сэрыі СУ—44 імя «Камсамольскай Праўды» і Щ—432 імя «Чырвонай Зьмены» не здаюць ударных тэмпаў перадавых барацьбітоў за сацыялістычны транспарт.

Усіх гэтых посьпехаў камсамольскія брыгады дабіліся ва ўпартай барацьбе за выкананьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

За час падрыхтоўкі да кантрольнага пленуму значна павялічыўся лік камсамольцаў ударнікаў. Калі ў чэрвені месяцы г. г. ударніцтвам было ахоплена 43 проц. усёй арганізацыі, дык зараз у шэрагах ударніцтва налічваецца каля 80 проц. усіх камсамольцаў.

За апошні час некаторыя прадпрыемствы гораду ня выконваюць свайго прамфінпляну (акулярная, «Чырвоны мэталіст» і г. д.), асабліва адстае транспарт. Значная доля віны ў гэтых прарывах кладзецца і на камсамольскую арганізацыю; рад калектываў і ячэек не ўзяліся з бальшавіцкай рашучасьцю за рэалізацыю 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

Пленум гаркому павінен намеціць рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія будуць садзейнічаць мабілізацыі мас камсамольцаў і беспартыйнай моладзі на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну на аснове практычнага ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна і ўключэньня ў сталінскі паход, абвешчанага „Камсамольскай Праўдай“.

Значныя посьпехі да 2-га кантрольнага пленуму віцебская камсамольская арганізацыя мае ў барацьбе за шмат мільённы камсамол. За 1931 год арганізацыя вырасла на 9 з паловай тысяч чалавек, налічваючы зараз у сваіх шэрагах звыш 13 тысяч чалавек.

Характэрнымі зьяўляюцца лічбы росту арганізацыі па кварталам 1931 г. Першы квартал—775, другі—2444, трэці—3857 і за два месяцы 4-га кварталу—кастрычнік і лістапад—2300 чалавек. Значна павысіўся рост арганізацыі пасьля МЮД. За верасень арганізацыя вырасла на 700 чал., кастрычнік—1025, лістапад—1275.

У сувязі з ростам арганізацыі, значна ўзрасла ўдзельная вага камсамолу на прадпрыемстве, павысілася яго актыўнасьць на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Да кантрольнага пленуму рад буйных фабрык і фабзавучаў у асноўным акамсамолены («Чырвоны мэталіст», Лекерта, ФЗВ «Дзьвіны», швэйнікаў, мэталістых і дорбудвучу). Рад камсамольскіх калектываў і ячэек падрыхтоўку да пленуму адзначылі значным ростам арганізацыі. Калектыў заводу „Чырвоны мэталіст“ за час падрыхтоўкі вырас на 99 чал., панчошная імя Клары Цэткін—на 192 чал., «Дзьвіна»—на 125 чал., «Прафінтэрн»—на 82 ч., калектыў цягі МББ чыгункі—108 ч.

Побач з гэтымі калектывамі, якія на справе ажыцьцяўляюць рашэньні 9-га ўсесаюзнага зьезду УсеЛКСМ аб шматмільённым камсамоле, ёсьць шэраг калектываў, якія адстаюць. Калектыў фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» пасьля МЮД панізіў тэмпы росту, за час падрыхтоўкі да пленуму вырас усяго на 71 чал., у той час, калі на фабрыцы працуе 2500 чал. моладзі, а ў камсамоле — ня больш 1700. Асобныя ячэйкі яшчэ на гэты дзень практыкуюць апартуністычную практыку ў пытаньнях росту (голкавая фабрыка, гнутай мэблі і інш.).

Як спраўляюцца паасобныя калектывы і ячэйкі з другой, ня менш важнай задачай, — замацаваньнем росту?

Трэба адзначыць, што ўзорным па замацаваньні росту зьяўляецца калектыў фабзавуча швэйнікаў, які да кантрольнага пленуму гаркому дабіўся 100-процантнага ахопу ўсіх навічкоў ударніцтвам, вучобай і на 95 проц. грамадзка палітычнай працай.

Рад навічкоў-камсамольцаў паказваюць узоры ўдарнай работы на прадпрыемствах. Напрыклад, токар Курбіцкі («Чырвоны мэталіст») да ўступленьня ў камсамол, працуючы на абточцы, выпрацоўваў 12 шасьцёрак, пасьля ўступленьня ў камсамол выпрацоўвае 20 шасьцёрак. На панчошнай фабрыцы вязальшчыца Школьнік да ўступленьня ў камсамол давала 20 дзесяткаў панчох, зараз 24 дзесяткі. Работніца Гнесіна (акулярная фабрыка) да ўступленьня ў камсамол выраблялa 240 апраў, пасьля ўступленьня ў КСМ вырабляе 340—360.

Гаркомам КСМ былі высунуты мерапрыемствы па замацаваньні росту, як-та: ленінская зарадка, рахунак-заказ усім прафэсыянальным, гаспадарчым арганізацыям. Першае мерапрыемства ажыцьцяўляецца. Дрэнна абстаіць справа з высунутым гаркомам рахункам-заказам. За выключэньнем паасобных арганізацый («Віцебскі Пралетары», Белдзяржкіно) ніхто не дапамагае ў пытаньні замацаваньня росту. Ёсьць шэраг фактаў дрэннай пастаноўкі работы па замацаваньню росту (акулярная, панчошная і інш.).

Пленум павінен вызначыць шэраг практычных мерапрыемстваў па палепшаньні працы па замацаваньню росту, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на марксысцка-ленінскае выхаваньне навічкоў, 100-процантны ахоп ударніцтвам і грамадзка-палітычнай працай. Уся праца па замацаваньню росту павінна быць увязана з далейшай барацьбой віцебскай камсамольскай арганізацыі за шматмільённы камсамол.

Віцебскі камсамол павінен прыйсьці да 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ з яшчэ большымі посьпехамі ў сваёй працы. Зараз уся ўвага арганізацыі павінна быць накіравана на хутчэйшую ліквідацыю адставаньня чыгуначнага транспарту, на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, на ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе, на выкананьне дырэктыў аб 100-проц. ахопе рабочай моладзі камсамолам, на рашучае падвышэньне яго актыўнага ўдзелу ў чарговых палітычна-гаспадарчых задачах.

Я. Левін.

Конкурс нізавога друку па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Раўняцца па ўдарніках друку „ПРАФІНТЭРНУ“ і „ЧЫРВОНАГА МЭТАЛІСТА“.

Прыклады баявой работы „прафінтэрнаўцаў“—усяму нізавому друку і рабселькорам Віцебшчыны.

Нізавы друк—на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

«Праўда» зьяўляецца ініцыятарам усесаюзнага конкурсу нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў. Нізавы друк пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый павінен знаходзіцца ў першых шэрагах па правядзеньні конкурсу.

Газэты саўгасаў і калгасаў павінны мабілізаваць масы калгасьнікаў на вырашэньне паасобных канкрэтных задач па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні.

Фабрыка «Прафінтэрн» і шматтыражка «Прафінтэрнавец» паслалі брыгаду рабкораў ударнікаў у дапамогу насьценгазэтам падшэфных калгасаў. Днямі мы падавалі матар'ял аб становішчы калгасаў Рудакоўскага сельсавету, над якім шэфствуе фабрыка і работа, якая праведзена ўдарнай брыгадай друку ў справе арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў. Сёньня мы зьмяшчаем дагавор, заключаны між рабочымі тэхчасткі фабрыкі «Прафінтэрн» і калгасам імя Леніна.

Работа, праведзеная ўдарнікамі друку і шматтыражкай „Прафінтэрнавец“ па арганізацыйна-гаспадарчаму замацаваньню калгасаў, практычна вырашае задачы паходу. Прыклады «прафінтэрнаўцаў» павінны быць перанесены на ўсе прадпрыемствы.

Правядзеньне конкурсу павінна быць цесна ўвязана з наладжваньнем шэфскай работы. Рабочыя шэфы нясуць адказнасьць за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне падшэфных калгасаў. Вось чаму прадпрыемствы—шэфы, шэфскія рабочыя брыгады павінны дапамагчы нізавому друку калгасаў у яго барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне.

Забясьпечыць апэрацыйнасьць у рабоце калгасных газэт, дабіцца таго, каб яны былі сапраўды баявымі памочнікамі партыі ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў—наша баявая задача.

Падшэфны заводу „Чырвоны мэталіст“ калгас „Прагрэс“ уключыўся ў конкурс.

Селькорамі калгасу «Прагрэс» сумесна з брыгадай рабкораў заводу „Чырвоны мэталіст“ быў праведзены рэйд па праверцы выкананьня ўсіх відаў нарыхтовак і фінпляну.

Рэйд выявіў: па пляну неабходна здаць дзяржаве збожжавых культур 110 цэнтнераў, здадзена 100. Плян сенанарыхтовак поўнасьцю выкананы. Ільновалакна па пляну неабходна здаць 25 цэнтнераў, здадзена толькі 18,51 цэнтнера. Невыкананьне пляну здачы ільновалакна тлумачыцца тым, што брыгада, якая апрацоўвала лён, нядбайна адносілася да сваёй працы. Меліся выпадкі пакражы валакна з боку калгасьнікаў Бруевай Ульяны, Юрковай Ф., Станкевіч Я. і Селязьнёва. Гэтыя калгасьнікі прыцягваюцца да адказнасьці. Па нарыхтоўках гародніны плян выканан на 100 проц.

Акцыі Трактарацэнтру ў суме 1500 руб. рэалізаваны поўнасьцю. Грошы за машынныя абавязацельствы таксама выплачаны. Аказана матар'яльная дапамога курсантам і вучням.

Калгас выканаў свае абавязкі (акрамя ільну) дзякуючы шырокай растлумачальнай рабоце, праведзенай камсамольскай ячэйкай і актывам калгасьнікаў, дзякуючы вялікай дапамозе, аказанай брыгадзірам заводу „Чырвоны мэталіст“ тав. Пірожнікавым.

З боку некаторых калгасьнікаў былі праяўлены спажывецкія настроі. Калгасьніцы Юркова і Багданава агітавалі за тое, каб спачатку ільном, бульбай і інш. прадуктамі забясьпечыць сябе. Такія настроі атрымалі рашучы адпор.

Калгасьнікі і селькоры калгасу «Прагрэс» завяраюць рабочых заводу «Чырвоны мэталіст», што ў праводзімым конкурсе па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, яны не адстануць ад усяе рабочае масы і накіруюць усю ўвагу на ўзьняцьцё калгаснай вытворчасьці. Брыгада: Дчемяшкевіч, Раманаў, Федарэнка В.

Дагавор двух.

Рабочыя тэхчасткі і рабкоры фабрыкі «Прафінтэрн» заключылі сацдагавор з калгасам імя Леніна.

Рабочыя тэхчасткі і рабкоры ф-кі „Прафінтэрн“, выехаўшыя ў калгас імя Леніна, Рудакоўскага сельсавету, па правядзенью конкурсу нізавых газэт па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў заключылі дагавор — абавязацельства між калгасьнікамі калгасу імя Леніна і шэфамі—рабочымі швэйнай фабрыкі.

— Мы, калгасьнікі вёскі Бутырма—гаворыцца ў дагаворы—аб'яднаўшыся вясной бягучага году ў калгас імя Леніна, пад кіраўніцтвам партыі, у барацьбе за сацыялістычную гаспадарку дабіліся значных дасягненьняў, З уборачнай кампаніяй мы поўнасьцю і сваечасова справіліся.

Мы, калгасьнікі калгасу імя Леніна, бярэм на сябе наступныя абавязкі:

Прывесьці ў парадак усю цягавую сілу. Наладзіць дагляд за жывёлай, забясьпечыць яе кармамі.

Вылучыць у дапамогу па дагляду за жывёлай на скотны двор яшчэ аднаго чалавека.

Прывесьці ў парадак інвэнтар, прымацаваўшы да сельска гаспадарчых машын і ўсяго інвэнтару калгасьнікаў.

Вызначыць нормы корму кароў, коняй і цялят.

Прывесьці ў належны парадак хавальнікі з бульбай.

Разьмеркаваць увесь ураджай і даход толькі па прынцыпу „хто больш працуе, той больш і атрымлівае»—выключна па працаднёх.

Апрацаваць і здаць дзяржаве лён у вызначаны тэрмін. Прэміяваць лепшых ударнікаў.

Зьнішчыць прагулы і нядобрасумленныя адносіны да работы. Усе недахопы і дасягненьні калгасу шырока асьвятляць у штодзёнках, фабрычнай шматтыражцы і „Віцебскім пралетары“.

У адзнаку прыняцьця шэфства рабочымі фабрыкі «Прафінтэрн» арганізуем чырвоны абоз са збожжам і гароднінай.

* *

Мы, рабочыя тэхчасткі фабрыкі «Прафінтэрн» пад кіраўніцтвам партыі, выканалі пяцігадовы плян у тры гады толькі таму, што сваечасова перабудавалі сваю працу, зьнішчылі абязьлічку і ўраўнілаўку, узьнялі на належную вышыню сацспаборніцтва і ўдарніцтва, разгарнулі рацыяналізатарскую работу.

Разам з гэтым у нас ёсьць і недахопы, якія абяцаем зьнішчыць і дабіцца яшчэ большых посьпехаў.

Мы абавязуемся:

Поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку і ўраўнілаўку.

Ліквідаваць прагулы.

Паставіць на належную вышыню працу ўдарных брыгад (рацыяналізатарскіх, гаспразьліковых і інш.).

Перавесьці ўсю тэхчастку на гаспадарчы разрахунак, уступіць усім у ячэйку шэфскага таварыства, актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх праводзімых на фабрыцы кампаніях. Дапамагаць калгасу ў яго арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні, выслаць брыгаду ў калгас імя Леніна па рамонту інвэнтару.

Калі калгасьнікі выканаюць поўнасьцю вызначаныя абавязацельствы, мы, рабочыя, абавязуемся прэміяваць вашых лепшых ударнікаў і ўдарніц.

Старшыня шэфбюро калгасу імя Леніна Качаеў.

Старшыня калгасу імя Леніна Ганчароў.

Ад рабочых тэхчасткі фабрыкі «Прафінтэрн» Рэўт.

Пасылаем яшчэ адну брыгаду.

Заслухаўшы справаздачу брыгады, якая была паслана ў Рудакоўскі сельсавет вэтрабфакам для правядзеньня работы па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, парт'ячэйка і прафком пастанавілі накіраваць яшчэ адну брыгаду для непасрэднага ўдзелу і практычнай дапамогі калгасу імя т. Сталіна, Рудакоўскага сельсавету.

Брыгада павінна наладзіць у калгасе імя Сталіна зьдзельшчыну, арганізаваць выпуск насьценгазэты, дапамагчы калгасу рацыянальна скарыстоўваць маючуюся рабочую сілу. Наладзіць культурна-выхаваўчую работу.

Данкоў.

…а 15-га сьнежня рэалізаваць …датковае заданьне па падпісцы на пазыку „Трэці рашаючы“.

У тэрмін і поўнасьцю

РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАЗЫКУ НА 1.090.000 РУБЛЁЎ.

…зімая фінэстафэта дала на… …ух у справе мабілізацыі … На тых прадпрыемствах, …анізацыі вразумелі важ… …выкананьня фінпляну, ма… …брыя вынікі ў напрамку …бочых і служачых ашчад… …лектыўным страхаваньнем …ай на пазыку «3-ці рашаю… …рафінтэрн», фабрыка імя …і камтрэст). Шмат-жа прад… …заў не ўвязалі растлума… …работу з канкрэтнай пра… …фармленьню рашэньняў сха… …ых і служачых аб практыч… …еле ў выкананьні фінпляну і …а такім чынам зьвялася к …наму прыёму рэзалюцыі …індустрыялізацыі», «Мэта… …», Дзьвіна» і панчошная). Мы …чнае адставаньне ў выка… …аданьня 4-га кварталу па …вотных паступленьнях. …ні па ўкладам на 1-е сьнеж… …аны толькі на 39 проц., па …ўнаму страхаваньню — на

Застаўшыяся да канца кварталу лічаныя дні павінны даць поўнае выкананьне заданьня па добраахвотных паступленьнях 4-га кварталу. Для гэтага трэба, каб усе арганізацыі нашых прадпрыемстваў і ўстаноў павялі шырокую растлумачальную працу сярод рабочых і служачых аб значэньні сваечасовага выкананьня фінпляну для агульна-гаспадарчага пляну, увязваючы растлумачальную работу з практычнымі дзеямі.

Падпіска на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі» на 1-е сьнежня па гораду і раёну складае 4.467 тысяч рублёў, альбо 116 процантаў заданьня.

Улічваючы, што шмат рабочых, якія прыйшлі ў прамысловасьць пасьля асноўнай кампаніі па рэалізацыі пазыкі і гэткай не ахоплены, наркамфінам вызначана Віцебску дадатковае заданьне. **Нам трэба рэалізаваць пазыку яшчэ на 1.090 тысяч рублёў.** За апошнія 10 дзён падпіска дала толькі 67 тысяч рублёў. Гэта ёсьць вынік таго, што праца па рэалізацыі дадатковага заданьня на пазыку на мясцох не разгорнута, як належыць. Пастанова сакратарыяту гаркому аб разгортваньні працы з такім разьлікам, каб да 15-га сьнежня скончыць рэалізацыю пазыкі на 1.090.000 руб. не ўсвядомлена ў практычнай працы калектывамі і ячэйкамі КП(б)Б.

Да 15-га сьнежня засталася 5 дзён, тэрмін, упаўне дастатковы для таго, каб мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць, увесь актыў фінработнікаў на правядзеньне падпіскі на пазыку сярод тых слаёў рабочых, якія яшчэ не зьяўляюцца трымацелямі пазыкі. Уся гэтая работа павінна праводзіцца пры шырока разгорнутым сацспаборніцтве і ўдарніцтве.

Трэба дабіцца, каб адміністрацыі прадпрыемстваў і ўстаноў прадстаўлялі без усялякіх затрымак фабзаўмясцкомам альбо камісіям садзейнічаньня сьпісы ўноў прыбыўшых на працу і не ахопленых падпіскай на пазыку рабочых і служачых таму, што да гэтага часу гэтыя зьвесткі адміністрацыяй не прадстаўляюцца, нягледзячы на прапанову як з боку ВСНГ, так і пастановы сэкратарыяту гаркому.

Калі важнасьць працы па выкананьні дадатковага заданьня на пазыку будзе ўсьвядомлена ўсёй грамадзкасьцю, правільнай пастаноўкі растлумачальна-арганізацыйнай працы і сваечасовым прадстаўленьні бухгальтэрыяй прадпрыемстваў і ўстаноў неабходных сьпісаў і зьвестак фабзаўмясцкомам, пастанова сэкратарыяту гаркому аб выкананьні дадатковага заданьня на пазыку да 15-га сьнежня будзе з гонарам выканана.

Бабіцкі.

…шыраны пленум гаркому КП(б)Б.

…2-га сьнежня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні гаркому …адбудзецца **пашыраны пленум гаркому.**

На абвестцы дню:

…б кантрольных лічбах на 1932 год (**Жуковіч**).

…б становішчы партасьветы (**Гаеўскі**).

…б рабоце камсамольскай арганізацыі (**Левін**).

…а пленум павінны зьявіцца: члены і кандыдаты гаркому КП(б)Б, …ары партячэек і калектываў, кіраўнікі прадпрыемстваў і старшыні …—партыйцы.

Пропускі на пленум атрымаць у гаркоме партыі (пакой № 8).

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ ШАСЬЦІ УМОЎ Т. СТАЛ

Прарыў у выкананьні прамфінпляну на панчошна-трыкатажным камбінаце імя „КІМ“—рэзультат работы фабрычных арганізацый па-старынцы ў новых умовах.

Масавы рэйд ударнікаў друку—газэт „Праўда“, „Зьвязда“ і „Віцебскі Пралетары“ за рэалізацыю 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

Паказаньні правадыра ў жыцьцё не праведзены.

93 рабкоры-ударнікі **«Праўды», «Зьвязды» і «Віцебскага Пралетарыя»** правялі масавы рэйд па пытаньні праверкі рэалізацыі 6-ці ўмоў т. Сталіна на віцебскім панчошна-трыкатажным камбінаце імя КІМ.

Яшчэ да пачатку рэйду брыгада разам з фабрычнымі арганізацыямі правяла шырокую растлумачальную работу ў цэхах аб значэньні праверкі. Дзякуючы праведзенай падрыхтоўчай рабоце, з боку рабочых была вялікая зацікаўленасьць і актыўны непасрэдны ўдзел у правядзеньні рэйду.

„...Арганізавана набіраць рабочую сілу ў парадку дагавароў з калгасамі, мэханізаваць працу—такава задача“ (Сталін).

Не спадзявацца на самацёк.

Панчошны камбінат адчувае вялікі недахоп у рабочае сіле. Для поўнай нагрузкі нехапае каля 400 чал. На першы квартал 1932 года камбінату неабходны 2 тысячы рабочых, фактычна-ж ёсьць толькі палова. Фабрычныя арганізацыі не карыстаюцца сталінскім указаньнем—арганізавана набіраць рабочую сілу, а не спадзявацца на самацёк. Між тым, заключаны толькі адзін дагавор (з калгасам імя т. Сталіна на 75 рабочых), але і гэты дагавор ня выконваецца. Усяго на камбінат з калгасу прыйшлі 25 чал.

Работнікі, адказваючыя за гэтую галіну працы, павінны выпрацаваць цьвёрды плян патрэбнае рабочае сілы, вярбоўку якой праводзіць шляхам заключэньня сталых дагавароў з калгасамі.

Мэханізаваць падсобныя працэсы работ.

Недахоп рабочае сілы ўскладае на фабрычныя арганізацыі яшчэ большую адказнасьць за мэханізацыю працы. Між тым гэтаму пытаньню ўдзяляецца зусім мала ўвагі. Так, у фармовачным аддзяленьні з-за адсутнічаньня калясак для складаньня паўфабрыкатаў пагаршаецца якасьць прадукцыі. У сарціровачным цэху адсутнічаюць крэслы на калёсіках для складаньня і адвозкі гатовых вырабаў, у той час як пры набыцьці гэтых крэслаў магчыма скараціць рабочую сілу і паскорыць працэс работы. У фарбовачным цэху з-за адсутнічаньня полак для складваньня фарбаваных вырабаў, апошнія псуюцца і панчохі прыходзіцца другі раз перафарбоўваць. У барках яшчэ ня зроблены рашоткі, з-за чаго пры спуску вады, у каналізацыю часта пападаюць панчохі.

У мэханічным цэху праца не мэханізавана. Работа вытвараецца саматужным чынам. Варштатаў (такарны, фрэзэрны, сьвярлільны і інш.) тут няма. З прычыны такога становішча зрываюцца мантажныя работы, выраб запасных частак і іншыя працэсы, зьвязаныя з абсталяваньнем фабрыкі.

Стварыць БРІЗ на фабрыцы.

Рацыяналізатарская работа на фабрыцы не праводзіцца. БРІЗ не арганізаваны. Плян рацыяналізацыі адсутнічае. Фабрычныя арганізацыі ня ўцягваюць рабочую масу ў рацыяналізатарскую работу. За ўвесь час існаваньня фабрыкі (з ліпеня) ня было ніводнай вытворчай нарады, як у цэхах, паасобных вучастках, гэтак і на ўсёй фабрыцы. З адмтэхпэрсаналам таксама нарады не праводзяцца. Творчы ўздым рабочых, які знайшоў свой выраз у дачы вытворчых рацыяналізатарскіх прапаноў, адміністрацыяй фабрыкі не скарыстаны для арганізацыі і палепшаньня работы на паасобных вучастках. На агульным сходзе швэйна-кецельнага цэху рабочыя далі рад прапаноў, але ўсе яны засталіся на паперы. З-за такіх брыдкіх адносін адміністрацыі да рабочых указаньняў, прыток рабочых прапаноў спыніўся.

Мы прапануем трыкутніку фабрыкі неадкладна ўкамплектаваць БРІЗ і арганізаваць рацыяналізатарскія ячэйкі ў цэхах; выпрацаваць сталы плян рацыяналізатарскіх работ; неадкладна вылучыць дырэктара па рабочых прапановах, які павінен адказваць за своечасовую рэалізацыю рабочых прапаноў; завесьці сталы вучот паступленьня і выкананьня рабочых прапаноў і своечасова паведамляць аўтара аб лёсе іх прапаноў; разгарнуць масава-растлумачальную работу па збору рабочых прапаноў.

Вытворчы сэктар фабкому павінен сыстэматычна праводзіць вытворчыя нарады на паасобных вучастках работы.

...«Ліквідаваць цякучасьць рабочае сілы, зьнішчыць ураўнілаўку, правільна арганізаваць зарплату, палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задача“. (Сталін).

Існуючая на фабрыцы сыстэма аплаты працы не садзейнічае замацаваньню рабочых.

Фабрычныя арганізацыі з першых дзён работы фабрыкі не стварылі належныя ўмовы для замацаваньня сталага складу рабочых за вытворчасьцю. Цякучасьць рабочае сілы вялікая. У жніўні прыбыла 193 чал., уйшло 46. У верасьні прыбыла 345, звольнілася 44, у кастрычніку прыбыла 323—66 і ў лістападзе прыбыла 310 і атрымалі разьлік 46 чал.

Існуючая сыстэма зарплаты (старая) узята мэханічна з фабрыкі імя «Клары Цэткін». Нормы і расцэнкі ўстаноўлены не на падставе хронамэтражнага вывучэньня, а ўстанаўліваецца «на вока“, бо ТНБ яшчэ ня створана. Прэміяльна-прагрэсыўная сыстэма, якая дае стымул да павышэньня прадукцыйнасьці працы і заробку рабочых, на фабрыцы не прымяняецца. Аплата працы вытвараецца простай зьдзельшчынай, нават мае месца падзённая аплата. Падзёншчынай яшчэ ахоплены мэханікі, вучні-рэгуліроўшчыкі, работнікі кантрольнага апарату, паасобныя рабочыя і абслугоўваючы пэрсанал (цэхавая адміністрацыя і разрахунковы апарат).

Ураўнілаўка на фабрыцы ў пашане.

«Лявацкая» ураўнілаўка на фабрыцы ў пашане. У апрэтурна-фарбовачным цэху вядучая прафэсыя сартыроўшчыкі, якім устаноўлены шосты разрад і сярэдні іх заробак складае 55 руб. у месяц, між тым, як менш кваліфікаванаму і адказнаму працэсу работы таго-ж цэху—фармоўцы вызначаны сёмы разрад і заробак тут 75 рублёў,

Аднолькава адказная і кваліфікаваная работа (штопка), неаднолькава аплачваецца. Так, работаючыя на артыкуле № 300 выпрабляюць па 6—7 руб. у дзень, а на артыкуле № 110—2 руб. 50 кап.

Калі параўнаць працэс работы фармоўкі з сартыроўкай, дык атрымліваецца, што высокакваліфікаваныя рабочыя-сартыроўшчыкі атрымліваюць 55 руб. у месяц, у той час, калі мала кваліфікаваныя рабочыя зарабляюць па 70 руб.

Заробак больш кваліфікаваных рабочых швэйна-кецельнага цэху—кетлёўшчыцы—70 руб. у месяц у той час, калі кваліфікаваныя—аверлоўшчыцы зарабляюць па 100 руб.

Замест сыстэматычнай праверкі і падвышэньня разрадаў па пасьпяховасьці, вучням рэгуліроўшчыкам мэханічна падвышаецца разрад кожныя 3 месяцы.

Для зьнішчэньня ўраўнілаўкі ў зарплаце, для правільнай арганізацыі сыстэмы аплаты, якая-б садзейнічала падвышэньню кваліфікацыі і прадукцыйнасьці працы мы прапануем: неадкладна стварыць ТНБ, якое павінна праз хранамэтраж пракарэктаваць нормы і расцэнкі па паасобных відах работы. Усе працэсы работы перавесьці на зьдзельшчыну, укараніць прэміяльна-прагрэсыўную аплату працы, мабілізаваўшы на гэту справу ўсіх рабочых. Прафарганізацыі фабрыкі павінны правесьці шырокую растлумачальную работу аб значэньні пераводу цэхаў і паасобных вучасткаў на прэміяльна-прагрэсыўную зьдзельшчыну і ўкараненьні новай сыстэмы аплаты.

Жыльлёвыя ўмовы—вузкае месца на фабрыцы

Большая колькасьць рабочых складаецца з сялян-адыходнікаў, якіх трэба забясьпечыць кватэрамі. Маючыйся на тэрыторыі фабрыкі адзін інтэрнат не здавальняе ўсіх рабочых. У інтэрнаце брудна, падвойныя рамы не ўстаўлены, вадой не забясьпечаны, печы не ацяпляюцца, ложакі ламаныя, мэдычны нагляд адсутнічае. Культурна-масавая работа ў інтэрнаце не праводзіцца.

Маюцца выпадкі, калі прыяжджаючыя на фабрыку рабочыя з-за адсутнасьці жыльлёвай плошчы ўяжджаюць назад.

Белтэкстыльаб'яднаньне не адпускае сродкаў для заканчэньня пабудовы новага інтэрнату. Дрэнныя жыльлёвыя ўмовы ствараюць пагрозу зрыву забясьпечаньня фабрыкі новымі кадрамі.

Чаргі ў сталоўцы ня зьнішчаны.

Сталоўка яшчэ ня стала вузорным цэхам харчаваньня, якая павінна служыць выкананьню прамфінпляну. Чаргі ня зьнішчаны, рабочыя ўвесь абедзенны перапынак трацяць на чаканьне абедаў. Пасудай сталоўка не забясьпечана. Абсугоўваючы пэрсанал не пераводзіцаа на зьдзельшчыну, санмінімум не захоўваецца—Пасуда мыецца дрэнна. 3-я зьмена не забясьпечваецца гарачымі абедамі. Буфэт працуе нездавальняюча. Няма неабходных прадуктаў, нават і тых, якіх маецца ў дастатковай колькасьці ў ЦРК.

Гарбатай рабочыя таксама не забясьпечаны. Належачая сталоўцы гародніна не захоўваецца як належыць. Два вагоны бульбы, захаваныя ў падвале, гніюць з-за недастатковага ацяпленьня. Сьвінарнік неўкамплектаваны дастатковай колькасьцю сьвіней і не ацеплены. Замест 85 сьвіней ёсьць толькі 26. Адміністрацыя тармозіць сканчэньне пабудовы новага сьвінарніка.

ЗРК панчошвіц знаходзіцца ў горадзе і ня можа забясьпечваць своечасова тых работніц, якія жывуць на тэрыторыі фабрыкі ці ў раёне Маркаўшчыны. Неабходна адчыніць каля фабрыкі аддзяленьне ЗРК.

Для палепшаньня бытавых умоў рабочых мы прапануем: здабыць сродкі, мабілізаваўшы ўнутраныя рэсурсы фабрыкі, для хутчэйшага сканчэньня пабудовы новага інтэрнату. Белтэкстыльаб'яднаньне ў гэтай справе павінна дапамагчы матарыяльна; прывесьці ў належны парадак маючыяся на тэрыторыі фабрыкі інтэрнаты і ўсяліць туды маючых патрэбу ў кватэрах рабочых. Сталоўку трэба ператварыць у сапраўдны вузорны цэх харчаваньня; перавесьці на зьдзельшчыну абслугоўваючы пэрсанал, забясьпечыць сталовую пасудай. Строга захоўваць парадак чарговага абслугоўваньня цэхаў харчаваньнем. Выканаць умовы санмінімум, арганізаваўшы сталы кантроль мэдпэрсаналу фабрыкі.

З прычыны таго, што сталоўка знаходзіцца далёка ад фарбовачна-апратурнага цэху, адміністрацыя фабрыкі павінна здаволіць запатрабаваньні рабочых аб дастаўцы абедаў непасрэдна ў цэх.

Забясьпечыць гарачымі абедамі 3-ю зьмену. Палепшыць работу буфэту, забясьпечыўшы яго прадуктамі і гарбатай. Прыняць тэрміновыя меры да захоўваньня гародніны ад псоты. Ацяпліць маючыйся сьвінарнік і фарсаваць сканчэньне пабудовы новага сьвінарніка. Над работай ЗРК і сталоўкі трэба ўстанавіць сталы грамадзкі кантроль.

Адказных за ахову працы на фабрыцы няма.

Фабрычныя арганізацыі не зварачваюць належнай увагі на ахову працы, адказных за гэту справу няма. У фарбовачным цэху рабочыя прымушаны карыстацца пры мыцьці хімічна-атручанай вадой. Адміністрацыя марудзіць са сканчэньнем пабудовы душу. З-за няспраўнасьці вэнтыляцыі ў цэху скапляецца вялікая колькасьць пару.

Нягледзячы на тое, што мыла на складзе маецца, рабочым апошняе не выдаецца. У сьлясарна-кавальным цэху адсутнічаюць умывальнікі, ручнікі і мыла. Рабочыя прымушаны абедаць бруднымі, з бруднымі рукамі.

Паравое ацяпленьне ў мэханічным і вязальным цэхах няспраўнае. Цёплай сцэцвопраткай рабочыя не забясьпечаны. Прыбіральні не ацепляны і знаходзяцца на далёкай адлегласьці ад цэхаў.

Прафарганізацыі фабрыкі павінны ўзяць пад свой непасрэдны кантроль выкананьне правіл аховы працы, прыцягваючы да судовай адказнасьці вінаватых у парушэньні законапалажэньня аб ахове працы.

«Ліквідаваць абязьлічку, палепшыць арганізацыю працы, правільна расставіць сілы на прадпрыёмствах—такава задача“ (Сталін).

Гаспадарчае кіраўніцтва не мае адказных гаспадароў

Праца на фабрыцы арганізавана, дрэнна. Адсутнічае арганізацыйная структура ў сыстэме кіраўніцтва фабрыкай. Няма чоткага разьмеркаваньня функцый паміж работнікамі цэхаў і аддзелаў. Фабрыка дагэтуль ня мае мэханіка і працу апошняга выконвае тэхпэрсанал.

Патпартызацыя машын не праведзена, няма адказных за кіраўніцтва паасобнымі вытворчымі адзінкамі (воданасосная, кацельная, транспарт). У фарбовачна-апрэтурным цэху з прычыны вялікай цякучасьці рабочай сілы абслугоўваньне параформ абязьлічана.

У вязальным цэху рэгуліроўшчыкі не прымацаваны да паасобных вучасткаў работы. Вучоту выдаткаваньня і паломак голак па варштатах не вядзецца.

У рабоце цэхаў няма ўвязкі. З прычыны несвоечасовай падачы мотальным цэхам нітак, у вязальным цэху бываюць прастоі. Так, 6-га сьнежня па віне мотальнага цэху вязальшчыцы не працавалі 1 гадзіну 15 хвілін.

На фабрыцы не адчуваецца пэрсанальнай адказнасьці за якасьць выпускаемай прадукцыі. Процант браку расьце. У кастрычніку брак правышаў дапускаемую норму на 10проц., у лістападзе на 15. Ломка варштатных голак даходзіць у зьмену да 350—400 штук. **Штопка панчох ня ўлічваецца і расьцэньваецца аднолькава з добраякаснай прадукцыяй.**

У вязальным цэху з-за няправільнай устаноўкі паламаны 90 тавараадводаў і ніхто за гэту нядбайнасьць не панёс адказнасьці.

Мэханізмы скарыстоўваюцца няпоўнасьцю

З-за непадрыхтаванасьці належнай колькасьці кваліфікаваных кадраў, мэханізмы і абсталяваньне скарыстоўваюцца няпоўнасьцю. У швэйна-кецельным цэху бяздзейнічаюць 12 кецельных машын, а на 3-й зьмене не стаяць усе 99 машын і яшчэ 4 аверлокі. У вязальным цэху з прыбыўшых 212 аўтаматаў, якія павінны быць устаноўлены да 1-га студзеня, на сёньняшні дзень працуе толькі 159, а астатнія не ўстаноўлены і бяздзейнічаюць, з прычыны недахопу 11 рэгуліроўшчыкаў і 46 работніц. У фарбарна-апрэтурным цэху штодзённа не працуюць каля 30 параформ.

Ліквідаваць абязьлічку ва ўсіх зьвеньнях

Мы прапануем фабрычным арганізацыям неадкладна склікаць агульна фабрычную нараду, на якой выпрацаваць цьвёрдую арганізацыйную структуру кіраваньня цэхамі і паасобнымі працэсамі фабрыкі, устанавіўшы чоткае разьмеркаваньне праў і абавязкаў кожнага работніка. Забясьпечыць усе вытворчыя адзінкі цьвёрдым апэрацыйным гаспадарчым і тэхнічным кіраўніцтвам. Канчаткова ліквідаваць абязьлічку - шляхам правільнай расстаноўкі і прымацаваньня тэхпэрсаналу і работніц да сталых вучасткаў работы. Для зьнішчэньня няўвязкі паміж работай цэхаў сыстэматычна склікаць аб'яднаныя вытворчыя нарады цэхаў, залежачых адзін ад другога, на якіх выпрацоўваць канкрэтныя меры па зьнішчэньні паміжцэхавых непаладак. Таксама паставіць пытаньне перад арганізацыямі фабрыкі імя Клары Цэткін аб прыняцьці неадкладных мер па зьнішчэньні несвоечасовай дастаўкі і няправільнай дачы асартымэнтаў і паўфабрыкатаў для фабрыкі «КІМ».

Фабрычныя арганізацыі павінны мабілізаваць рабочых на барацьбу за добраякасную прадукцыю. Узмацніць цэхі кантрольным апаратам, устанавіўшы строгую пэрсанальную адказнасьць за брак.

Маецца ІТР, але няма ІТС.

Фабрыка «КІМ» поўнасьцю інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам не забясьпечана. З 24-х інжынэрна-тэхнічных работнікаў толькі адзін мае веды па тэкстыльна-трыкатажнай спэцыяльнасьці. Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал скарыстоўваецца не па прызначэньні. Інжынэр **Коган**—спэцыяліст па трыкатажнай справе—работае тэхнічным кіраўніком вязальнага цэху ў той час, як на пасадзе пам. тэхнарука ўсёй фабрыкі, які павінен добра ведаць трыкатажную справу, знаходзіцца тэхнік-электрамэханік.

Арганізацыі, якая павінна непасрэдна займацца пытаньнем кадраў—ІТС—**на фабрыцы няма, таксама як няма і тэхнічных гурткоў.** Арганізаваныя курсы рэгуліроўшчыкаў работаюць з перабоямі, бо курсы не прыстасаваны да зьмен і не забясьпечаны неабходным тэхнічным кіраўніцтвам. Курсы па падвышэньні кваліфікацыі рабочых не арганізаваны. Нават фабрычныя арганізацыі не забясьпечылі тэхнічных работнікаў неабходнымі падручнікамі для падвышэньня сваіх ведаў. Тэхнічнай бібліятэкі таксама няма.

З думкай маладых спэцыялістых ня лічацца.

Тэхнічны кіраўнік фабрыкі **Рабчым** не перадае маючыйся вопыт маладым спэцыялістым. Важныя пытаньні па рэканструкцыі фабрыкі не абгаварваюцца на тэхнічных нарадах. Так, пытаньне аб пабудове эстакады па падачы паліва ў кацельную сярод тэхпэрсаналу не абгаварвалася. Прапановы тэхнічных работнікаў дырэкцыяй фабрыкі ігнаруюцца і не ажыцьцяўляюцца. Так, прапанова старшага электраманцёра **т. Траяна** аб пабудове электравозу для падвозкі паліва з лесазаводу ў качагарку марынуецца да гэтага часу. Электравоз не патрабуе дэфіцытных матарыялаў і дае вялікі эканамічны эфэкт, вызваляючы ад працы 6 коняй і абслугоўваючы пэрсанал і галоўнае, паскарае дастаўку паліва.

Мы прапануем безадкладна арганізаваць бюро ІТС. Выпрацаваць канкрэтны каляндарны плян работы сэкцыі, арганізаваўшы ў кожным цэху зьменавыя тэхнічныя гурткі. Пры фабрыцы стварыць тэхнічныя курсы для падвышэньня ведаў малодшага тэхнічнага пэрсаналу па трыкатажнай справе. Вытворчы сэктар фабрычнага кіраўніцтва сумесна з ІТС павінен праводзіць рэгулярныя тэхнічныя нарады па спэцыяльных мэтавых пытаньнях. Вытворчы сэктар фабкому павінен забясьпечыць цэхі тэхнічнай літаратурак, прыстасаванай да спэцыяльных умоў кожнага цэху.

„Зьмяніць адносіны да інжынэрна-тэхнічных сіл, праяўляць да іх больш увагі і клопатаў“ (Сталін),

З боку арганізацый фабрыкі няма належнай увагі да палепшаньня бытавых умоў інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу. Увесь адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал атрымлівае прадукты і прамтавары па 2-му сьпісу, часта трацяць па некалькі гадзін у чарзе за атрыманьнем прадуктаў.

Брыдкія факты ўраўнілаўкі ў сыстэме зарплаты спэцыялістых.

Адміністрацыя фабрыкі не забясьпечыла адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў належнымі жыльлёвымі ўмовамі.

Так, тэхнік **Марудаў** жыве на кухні аднаго з інтэрнатаў фабрыкі і займае плошчу ў 1... кв. саж. Некаторыя работнікі жывуць у горадзе і прымушаны хадзіць пехатой на фабрыку, бо адміністрацыя фабрыкі не прыстасавала ім перавозных сродкаў. У зарплаце інжынэрна тэхнічнага пэрсаналу існуе ўраўнілаўка.

Тэхнік **Янаўлеў** пры пераводзе яго на пасаду пам. тэхнарука фабрыкі, застаўся пры стаёй старай пэнсіі ў **210 руб.**, у той час як майстра швэйна-кецельнага цэху атрымлівае **400 руб.**

Інжынэр-тэхнарук вязальнага цэху **Коган** атрымлівае 225 руб., а мэханікам гэтага цэху ўстаноўлена пэнсія ў 350 руб.

Загадчык аддзелам эксплёатацыі—тэхнік-электрык—атрымлівае 190 р., а манцёр **Траян**—225 руб.

Памочнік тэхнарука фабрыкі атрымлівае толькі на 10 руб. больш загадчыка складам.

Фабрычныя арганізацыі павінны неадкладна выканаць пастановы ЦК партыі ў галіне палепшаньня бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Сыстэма аплаты тэхпэрсаналу павінна быць устаноўлена ў адпаведнасьці іх кваліфікацыі і характару вытвараемых імі работ.

«Укараніць і замацаваць гаспадарчы разрахунак, узьняць унутрыпрамысловае накапленьне—такава задача». (Сталін).

Гаспадарчы разрахунак існуе толькі на паперы.

Гаспадарчы разрахунак на фабрыцы ўведзены фармальна. Дагаворы паміж цэхамі і аддзеламі фабрыч. кіраўніцтва не заключаны. Разрахункаў паміж цэхамі няма. Гаспадарчы дагавор з фабрыкай імя Клары Цэткін, якая забясьпечвае камбінат паўфабрыкатамі, не заключаны. З прычыны дастаўкі фабрыкай імя Клары Цэткін няправільнага асартымэнту, на складзе фарбовачна-апрэтурнага цэху стварыўся запас ў 200 тысяч пар панчох, а арганізацыі фабрыкі «КІМ» не прад'яўляюць ім ніякага рахунку.

Прагулы павялічваюцца.

Прагулы на фабрыцы павялічваюцца. У верасьні месяцы прагулы склалі 63 чалавека-дня, у кастрычніку 431 чалавекадзён, а ў лістападзе каля 500 чалавекадзён. Трэба адзначыць, што гэтыя лічбы недасканальныя, бо вучот прагулаў і цякучасьці на фабрыцы заблытаны.

Цэхі поўнасьцю не забясьпечаны рахункаводамі. Калькуляцыя сабекошту прадукцыі ня робіцца. Цэхавыя месячныя балянсы адсутнічаюць. Цэхавыя рахункаводы займаюцца амаль выключна выплатай зарплаты. Норма выдаткаваньня адзінкі апалу не ўстаноўлены, апал раскіданы на ўсёй тэрыторыі фабрыкі.

Арганізацыі фабрыкі павінны прыняць захады для зьнішчэньня ўсіх пералічаных недахопаў, якія перашкаджаюць пераводу фабрык на сапраўдны гаспадарчы **разрахунак.**

„Па новаму работаць, па новаму кіраваць“ (Сталін).

Работа арганізацый не перабудавана.

Партыйная, прафэсыянальная і гаспадарчая арганізацыі яшчэ не перабудавалі сваёй работы, не перанясьлі цэнтр яе непасрэдна ў рабочую масу—цэхі, брыгады. У вязальным цэху 9 партыйцаў, а яшчэ не арганізавана партыйная ячэйка. Члены партыі далёка ня ўсе зьяўляюцца сапраўднымі перадавікамі ў барацьбе за рэалізацыю 6-ці ўмоў т. Сталіна. **Член партыі Барвінбум пры абгаварэньні пытаньня аб ліквідацыі абязьлічкі, выступіў у абарону яе.**

Прафэсыянальныя арганізацыі стаяць у баку ад творчага ўздыму рабочых. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня носяць масавы характар. Вучот эфэктыўнасьці працы ўдарнікаў адсутнічае. Вопыт работы лепшых не пераносіцца на астатнія вучасткі. Культурна-масавая работа не арганізавана. Барацьба за працдысцыпліну не разгорнута, не праводзіцца масавая праца па замацаваньню рабочых за вытворчасьцю.

Большы процант прагулаў і цякучасьці падае на моладзь. Камсамольскі калектыў яшчэ не заняўся штодзённай выхаваўчай працай сярод маладых рабочых. Арганізаваныя 16 га лістапада ў вязальным цэху дзьве маладзёжных гаспадарча-разрахунковых брыгады ня ўзяты пад кіраўніцтва камсамольскага калектыву, у выніку чаго брыгады існуюць толькі на паперы.

Гаспадарчыя арганізацыі не забясьпечылі належным кіраўніцтвам усе працэсы работы. **Абязьлічка ў гаспадарчым кіраўніцтве фабрыкі зьяўляецца адной з галоўнейшых прычын прарываў і не-**
выкананьня прамфін
3-га кварталу выкананы на
за кастрычнік—на 62,7 пр
Нізавы друк на фабры
арганізатарам мас вакол
леньня 6-ці ўмоў т. Ста
тыйная арганізацыя ня к
раўскім рухам. Насьценга
хах выходзяць нерэгуляр
білізуюць масы рабочых
вых задач сёньняшняга д

Фабрыка павінна даць бальшавіцк тадамі рабо

Фабрычныя арганізацы
безадкладна зьнішчыць
масавым рэйдам недахо
шчэньні. На аснове п
т. Сталіна трэба па - б
перабудаваць сваю працу
ваць рабочую масу на б
наньне задач, стаячых пе
кай.
Белтэкстыльаб'яднаньне
шыя гаспадарчыя арганіз
ны прыняць усе меры дл
ня і забесьпячэньня фаб
мі ў суме, зацьверджан
(3 мільёны руб.) на скан
тажных работ і палепша
вых умоў рабочых.
Аднначасова мы **прад'я**
летарскай грамадзкасьц
«Прамені» «Манс» Гель
воны мэталіст», «Камін
рахунак — максымальн
ваць выраб машын і
частак для фабрыкі.
Фабрыка «КІМ—адзін
«518»—павінна працаваць
бойна. Даць поўны ход
фабрыкі.
Брыгада ўдарнік
«Праўды», «Зьвязда
скі пралетары» —
рэйду: Ары. Зарубе
Максімаў, Файгін,
ляньян, М. Веліко
даў, Траян, Гофман
Гельфот, Фрыдма
гаўз, Нейдлін, Глоб
Патоцкая, Піталек
Гольбрайх, Ідаль,
Карашкова, Кузьмен
заравіч, Мітальнік
мыкскі, Кляц, Коган
Каган, Генкіна, Мар
раевіч, Рабіновіч, Кр
Паўлава, Расьлякова
ва, Сенежкіна, Сту
Шпакава, Кардзічкі
на, Малота, Барыш,
ва, Бравбург. Іонаў
леў, Янаўлеў, Трэшчо
лякоў, Дубельвіч, А
Пушкароў, Дыбані
Хаўкін, Павьяк, П
Найман, Міхайлоўск
Семёнаў, Тарарын, Б
Кузьняцоў, Іваноў,
Пыляе, брыгадамі і
сотнік ктарамі.
Іва дня: аб пра
твесь кампаніі і вы
ва, брыгад
рыцкі йнай,
Грыкі здароўя
скава, сэкцый
Грыка падат. Закесе
чарова, Баліскі, Пр
Мудрыкская.

Аб разгортваньні вытворча-тэхнічнай прапаганды.

З пастановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б.

Галоўнейшай задачай вытворча-тэхнічнай прапаганды ў сучасны пэрыяд павінна стаць барацьба за рэалізацыю рашэньняў партыі аб тэхнічнай рэканструкцыі нашай гаспадаркі. Ліквідацыя тэхнічнай няпісьменнасьці і ўцягненьне шырокіх мас у справу аўладаньня тэхнікай, выяўленьне іх творчай актыўнасьці і ініцыятывы. Аўладаньне марксысцка-ленінскай мэтадалёгіяй у справе стварэньня (праз асваеньне перадавой капіталістычнай тэхнікі) сацыялістычнай тэхнікі і арганізацыі сацыялістычных мэтадаў працы. Барацьба за поўную рэалізацыю шасьці ўмоў т. Сталіна.

ЦК КП(б)Б канстатуе, што сучаснае становішча разгортваньня вытворча-тэхнічнай прапаганды на прамысловых прадпрыемствах, саўгасах і калгасах БССР зьяўляецца зусім нездавальняючым (Усяго па данным т-ва «Аўладаць тэхнікай» ёсьць 359 гурткоў).

У мэтах забесьпячэньня разгортваньня работы па вытворча-тэхнічнай прапагандзе арганізаваць пры ВСНГБ самастойны сэктар па вытворча-тэхнічнай прапагандзе, пад асабістую адказнасьць т. Грысевіча ў дэкадны тэрмін укамплектаваць азначаны сэктар адпаведнымі кадрамі, забясьпечыўшы ўсю работу сэктара неабходнымі матарыяльнымі сродкамі і ўмовамі (бюджэт і г. д.).

Прапанаваць НКЗ, Белкалгасцэнтру, Трактарацэнтру і інш. цэнтральным гаспадарчым арганізацыям і аб'яднаньням не пазьней дэкаднага тэрміну вылучыць адказных кіраўнікоў па агра-тэхнічнай прапагандзе, распрацаваўшы палажэньні аб іх рабоце, устанавіўшы адказных людзей за штодзённае кіраўніцтва гэтай работай у нізавых зьвеньнях—завод, савгас, калгас.

Цэнтрам барацьбы за тэхнічную прапаганду павінны стаць завод, фабрыка, саўгас, калгас, будаўнічыя пляцоўкі, лябараторыі і вопытныя станцыі. Уся сыстэма масавай вытворча-тэхнічнай прапаганды і вучобы павінна прыстасоўвацца да мэтаў і задач усеагульнага тэхнічнага навучаньня рабочых мас і калгасьнікаў і ў першую чаргу ўдарнікаў і рабочых вядучых галін прамысловасьці. Ліквідацыя элемэнтарнай і тэхнічнай няпісьменнасьці шырокімі масамі рабочае клясы і ў першую чаргу новых рабочых. Павышэньне вытворча-тэхнічнай кваліфікацыі ўжо навучаных (кваліфікаваных рабочых) і ўзбраеньне іх навейшымі дасягненьнямі тэхнікі, а таксама павышэньне вытворча-тэхнічнай кваліфікацыі сярэдняга тэхнічнага, адміністрацыйна-інжынэрнага складу прадпрыемстваў. У адпаведнасьці з гэтым культпропу ЦК, сэктару тэхнічнай прапаганды ВСНГБ і астатнім арганізацыям распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі сеткі гурткоў, каротка-тэрміновых курсаў, лекцый, гутарак і г. д., устанавіўшы кантрольныя лічбы кантынгенту ахопу, распрацоўваючы адпаведныя праграмы, мэтад-паказаньні і інш.

Шырокае ўжываньне сельска-гаспадарчых машын, навейшыя дасягненьні агратэхнікі патрабуюць новага работніка, тэхнічна-пісьменнага, які аўладае гэтай тэхнікай. Таму агра-тэхнічная прапаганда і вучоба павінны быць накіраваны на падвышэньне ўзроўню агра-тэхнічных ведаў калгасьнікаў і рабочых савгасаў, азнаямленьне іх з пабудовай і работай сельска-гаспадарчых машын і трактароў, з правіламі дагляду за імі, падрыхтоўка новых кадраў работнікаў па розных галінах сельскае гаспадаркі, разгортваньне вынаходзтва і рацыяналізацыі ў сельскай гаспадарцы, павышэньне агра-тэхнічных ведаў усяго складу агра-тэхнічнага пэрсаналу.

Кадры кіраўнікоў гурткоў і курсаў, аўтараў масава-вытворча-тэхнічнай літаратуры павінны даць у першую чаргу масы студэнцтва ВУЗаў, ВТУЗаў, арганізацыі ІТР, навукова-дасьледчага інстытуту і г. д.

ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі стаць на чале арганізацыі гэтага грамадзкага актыву і прыцягненьне яго да работы па вытворча-тэхнічнай прапагандзе і вучобе, складаючы адпаведныя ўмовы для іх работы па выяўленьні ініцыятывы і актыўнасьці ў гэтай справе.

